Журнал международного права и международных отношений. 2025. № 1/2 (112/113). С. 25—30.
Journal of International Law and International Relations. 2025. N 1/2 (112/113). P. 25—30.
УДК 327(476)«2006/2022»

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІ Ў 2006—2022 гг.

**Аляксандр Гурын**

*Артыкул прысвечаны аналізу праблемна-тэматычных накірункаў навуковага даследавання гісторыі і актуальных праблем знешняй палітыкі Беларусі, якія распрацоўваліся айчыннымі вучонымі ў 2006—2022 гг. На падставе аналізу тэматыкі даследаванняў выяўлены найбольш вывучаныя тэмы і тэмы, якія з шэрагу прычын засталіся па-за ўвагай айчынных вучоных. Абгрунтаваны тэзіс аб наяўнасці нацыянальнай школы даследавання гісторыі і актуальных праблем знешняй палітыкі Беларусі, разгледжаны колькасныя і якасныя вынікі яе развіцця ў постсавецкі перыяд.*

*Ключавыя словы: гістарыяграфія міжнародных адносін; даследаванне міжнародных адносін; знешняя палітыка; міжнародныя адносіны; палітычныя праблемы міжнародных адносін.*

***«Belarusian Foreign Policy Studies (2006—2022)» (Aliaksandr Huryn)***

*The article surveys problem-driven and thematic strands in Belarusian scholarship on the history and contemporary issues of Belarus's foreign policy during 2006–2022. Through systematic examination of research outputs, it identifies the fields that have attracted sustained attention and those that remain understudied. The author substantiates the existence of a distinct national school for the study of Belarusian foreign policy and evaluates the quantitative and qualitative development of this field in the post-Soviet period.*

*Keywords: foreign policy; historiography of international relations; international relations; international relations studies; political aspects of international relations.*

Развіццё нацыянальнай школы міжнародных даследаванняў, якая сфарміравалася ў постсавецкі перыяд у Рэспубліцы Беларусь, акрамя іншых вынікаў, паказала значную эфектыўнасць правядзення даследаванняў у сферы гісторыі і сучаснага стану знешняй палітыкі Беларусі. Аднак тэматыка такіх даследаванняў не была прадметам спецыяльнай працы. У першую чаргу, гэта адносіцца да другога перыяду развіцця навукі аб міжнародных адносінах у краіне, які пачаўся прыкладна пасля 2005 г., калі яе развіццё істотна запаволілася. Першы перыяд постсавецкага этапу развіцця навукі аб міжнародных адносінах (1992—2005 гг.) раней ужо асвятляўся айчыннымі вучонымі, у тым ліку аўтарам гэтай працы. Таму мэтай артыкула з'яўляецца аналіз накірункаў навуковага даследавання гісторыі і актуальных праблем знешняй палітыкі Беларусі, якія распрацоўваліся айчыннымі вучонымі ў перыяд з 2006 па 2022 г.

Тэматыка навуковых даследаванняў гісторыі і праблем знешняй палітыкі Беларусі, якія ажыццяўляліся беларускімі вучонымі ў перыяд 2006—2022 гг., істотна не змянілася ў параўнанні з першым перыядам постсавецкага этапа існавання міжнародных даследаванняў у краіне (1992—2005 гг.). Але агульны аналіз тэматыкі даследаванняў паказвае, што ў параўнанні з савецкім перыядам навуковыя інтарэсы беларускіх вучоных у галіне гісторыі знешняй палітыкі краіны значна змянілася: сталі больш актыўна вывучацца міжнародныя адносіны перыядаў Сярэднявечча і Новага часу, былі істотна перагледжаны вынікі знешнепалітычнай дзейнасці БССР, пачалі распрацоўвацца пытанні сучасных праблем знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.

Разгледзім больш падрабязна накірункі навуковага даследавання гісторыі і палітычных праблем знешняй палітыкі Беларусі, якія распрацоўваліся беларускімі вучонымі ў 2006—2022 гг.

Даследаванне знешняй палітыкі старажытнабеларускіх дзяржаў, Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) і Рэчы Паспалітай стала ажыццяўляцца ў Беларусі толькі ў постсавецкі перыяд. Айчынныя вучоныя ўпершыню атрымалі магчымасць свабодна пісаць аб самастойнасці знешняй палітыкі беларускіх дзяржаў перыяду Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Навуковых распрацовак па гэтай тэматыцы няшмат, вялікая колькасць даследаванняў, у першую чаргу прысвеча-

*Аўтар:*
**Гурын Аляксандр Валер'евіч** — кандыдат гістарычных навук, дацент, дактарант кафедры міжнародных адносін факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, *e-mail: mpp.iup@mail.ru*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Адрас: 4, пр. Незалежнасці, Мінск, 220030, БЕЛАРУСЬ*

*Author:*
**Huryn Aliaksandr** — Candidate of History, Associate Professor, Doctorant of the Department of International Relations of the Faculty of International Relations, Belarusian State University, *e-mail: mpp.iup@mail.ru*
*Belarusian State University. Address: 4, Nezavisimosti ave., Minsk, 220030, BELARUS*

ных гісторыі старажытнабеларускіх дзяржаў, насіла навукова-папулярны характар. Пры гэтым у 2000—2010-я гг. назіралася відавочная тэндэнцыя ўзмацнення цікавасці да дыпламатычнай гісторыі ВКЛ.

Першай працай, у якой былі прааналізаваны адносіны ВКЛ з суседнімі дзяржавамі, стала кандыдацкая дысертацыя У. І. Канановіча, абароненая ў 1995 г. [23]. Перыяд месца ВКЛ у міжнародных адносінах ва Усходняй Еўропе ў XVI—XVII стст. у сваіх дысертацыях даследавалі А. В. Дземідовіч [15], М. А. Шніп [67]. Спецыфіка дыпламатычнай службы ВКЛ у межах знешнепалітычнага механізма Рэчы Паспалітай даследавана ў кандыдацкіх дысертацыях В. І. Лазоркінай [25], С. А. Лашкевіча [28]. Пытанні знешняй палітыкі ВКЛ і яго адносін з еўрапейскімі краінамі знайшлі адлюстраванне ў шэрагу манаграфій айчынных вучоных, апублікаваных у даследаваны перыяд [26; 27; 60; 69].

Даследаванне дыпламатычнай гісторыі старажытнай Беларусі, ВКЛ і Рэчы Паспалітай ажыццяўляў У. Е. Снапкоўскі. Вынікі яго работы знайшлі адлюстраванне ў публікацыях, надрукаваных у навуковых часопісах [56; 57].

Міжнародныя аспекты дзяржаваўтваральных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў 1918—1920-я гг., а таксама ў міжваенны перыяд таксама пачалі дэталёва даследаваць толькі ў постсавецкі перыяд. Пры гэтым беларускія вучоныя атрымалі магчымасць пісаць на розныя міжнародныя тэмы.

Так, актывізавалася даследаванне савецка-польскіх адносін, звязаных з падзелам Беларусі ў 1920-я гг. і аб'яднаннем Заходняй Беларусі з БССР. Рыжскі мірны дагавор 1921 г. як падзея сусветна-гістарычнага значэння на дзесяцігоддзі вызначыў лёс беларускага народа. Не меншую каштоўнасць для Беларусі маюць падзеі 1939 г., дзякуючы якім БССР была ўзноўлена ў этнічных межах.

Сістэмнае даследаванне гісторыі савецка-польскіх перамоў 1918—1921 гг. ажыццявіла В. М. Бароўская, якая ў сваіх працах падрабязным чынам разгледзела беларускае пытанне на гэтых перамовах, праблемы вызначэння савецка-польскай мяжы, дзейнасць Польска-расійска-ўкраінскай ваеннай узгадняльнай камісіі на тэрыторыі Беларусі [1; 6].

Падчас угодкаў пералічаных падзей адбылося некалькі навуковых канферэнцый, прысвечаных ім, дзе разглядаліся у тым ліку і міжнародныя аспекты [9; 36; 41]. Таксама было апублікавана некалькі зборнікаў дакументаў і матэрыялаў [37; 54].

У міжнародных даследаваннях незалежнай Беларусі новы імпульс набыло вывучэнне адносін БССР с замежнымі краінамі ў міжваенны перыяд.

Асобна трэба адзначыць манаграфію У. Е. Снапкоўскага, у якой разглядаюцца беларуска-польскія адносіны з 1918 г., калі адбылося адраджэнне беларускай і польскай дзяржаўнасці. Вялікую ўвагу аўтар звяртае на палітычныя і дыпламатычныя падзеі савецка-польскай вайны 1919—1920 гг. і беларуска-польскія стасункі напярэдадні і падчас Другой сусветнай вайны. У працы У. Е. Снапкоўскага разгледжаны таксама пасляваенны і сучасны этапы беларуска-польскіх адносін: супрацоўніцтва ў 45-гадовы перыяд «рэальнага сацыялізму» (1944—1989 гг.), станаўленне і развіццё міждзяржаўных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча [58].

Знешнепалітычная дзейнасць БССР пасля 1944 г. — адна з найбольш даследаваных тэм беларускай гістарыяграфіі міжнародных адносін. Аднак толькі ў постсавецкі перыяд вучоныя адышлі ад савецкай метадалогіі і атрымалі доступ да новых дакументаў, што дало магчымасць асэнсаваць праблематыку з пункту гледжання нацыянальнай навуковай канцэпцыі. Адной з галоўных тэм пры даследаванні гэтых праблем, як і ў савецкі перыяд, засталося супрацоўніцтва БССР з замежнымі краінамі. Значная колькасць прац у межах праблематыкі была выканана ці абаронена ў перыяд да 2005 г., але і пазней даследаванне знешнепалітычнай дзейнасці БССР не прыпынялася.

Беларуска-польскія эканамічныя, навукова-тэхнічныя і культурныя сувязі даследавала В. М. Важнік, якая на падставе раней невядомых архіўных дакументаў вызначыла накірункі, формы і метады двухбаковых адносін, выявіла дынаміку супрацоўніцтва краін, вызначыла месца Польшчы сярод краін, з якімі БССР ажыццяўляла стасункі ў 1949—1979 гг. [7].

У працах У. Е. Снапкоўскага ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі праведзены глыбокі і крытычны аналіз знешнепалітычнай дзейнасці БССР у 1944—1953 гг. Найбольш значныя работы па гэтай тэматыцы былі апублікаваны ў перыяд да 2005 г., але і пазней праблемы гісторыі знешняй палітыкі БССР знайшлі сваё адлюстраванне ў публікацыях У. Е. Снапкоўскага ў навуковых выданнях [49; 51; 52].

Міжнароднае супрацоўніцтва Акадэміі навук БССР у 1950—1980-я гг. даследавала Н. Я. Дзядзічкіна [18].

У 1990—2010-я гг. захоўваўся інтарэс да праблем удзелу Беларусі ў рабоце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН) і яе спецыялізаваных устаноў, якія ўпершыню сталі даследавацца яшчэ ў пасляваенны перыяд. У постсавецкі перыяд былі апублікаваны фундаментальныя навуковыя працы ў гэтай галіне. Сярод іх трэба зазначыць працы У. Е. Снапкоўскага, які даследаваў складаны шлях БССР у ААН, вызначыў прычыны і перадумовы ўваходжання рэспублікі ў арганізацыю ў якасці заснавальніцы [53; 59]. Падсумаваннем даследаванняў месца БССР у ААН стала яго

манаграфія аб дыпламатычнай барацьбе СССР за першапачатковае членства ў ААН Украінскай ССР і Беларускай ССР, апублікаваная ў 2022 г. [50]. Мэтай даследавання стаў аналіз асноўных падзей дыпламатычнай гісторыі Другой сусветнай вайны, звязаных з праблемай міжнароднага прадстаўніцтва і першапачатковавага ўдзелу рэспублік СССР у ААН.

Мэты, задачы, арганізацыйныя асновы дзейнасці БССР у ЮНЕСКА на працягу першага дзесяцігоддзя яе ўдзелу ў рабоце гэтай арганізацыі даследавала ў сваіх працах С. Ф. Свілас. У манаграфіі, апублікаванай у 2013 г., выяўлены этапы супрацоўніцтва БССР і ЮНЕСКА, яго накірункі і змест, прааналізаваны дасягненні і праблемы іх узаемадзеяння [42]. У 2018 г. С. Ф. Свілас абараніла доктарскую дысертацыю па гэтай праблематыцы [44].

Удзелу Беларусі ў дзейнасці ЮНЕСКА ў 1984—2001 гг. прысвечана кандыдацкая дысертацыя Р. Г. Раманоўскага [38].

Вывучэнне гістарыяграфіі знешняй палітыкі Беларусі як накірунка айчыннай гуманітарнай навукі пачало фарміравацца пасля абвяшчэння незалежнасці краіны. На першым этапе свайго станаўлення навука насіла эпізадычны характар і ў большасці выпадкаў закранала толькі сучасную на той момант праблематыку. С пачатку 2000-х гг. тэматыка і якасць даследаванняў значна пашырыліся. Да таго ж трэба дадаць, што з’явілася магчымасць гістарычных даследаванняў, таму што шэраг падзей ужо паспелі стаць гісторыяй краіны. Пры гэтым гістарыяграфія знешняй палітыкі незалежнай Беларусі не пакідала па-за увагай і сучасныя на момант даследаванняў пытанні.

Асноўнай праблемай, з якой сутыкнулася маладая беларуская дыпламатыя, стала вызначэнне прыярытэтаў знешняй палітыкі краіны, што было немагчыма без навуковага аналізу. У 1992—2005 гг. даследаванне гэтай праблематыкі ажыццяўлялася, як кажуць, па гарачых слядах на ўзроўні навуковых артыкулаў. У перыяд 2006—2022 гг. аналіз стаў насіць больш фундаментальны характар.

Так, у 2011 г. быў апублікаваны навуковы зборнік «Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь у 2000-я гады», у якім даследаваліся асноўныя аспекты знешняй палітыкі Беларусі, яе прыярэтэты, асаблівасці будавання адносін з рознымі краінамі свету і міжнароднымі арганізацыямі [8].

У працы А. В. Ціхамірава раскрыты асноўныя праблемы выпрацоўкі і рэалізацыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь у 1991—2015 гг. Асаблівую ўвагу аўтар звярнуў на фарміраванне асноў знешняй палітыкі, міжнародныя аспекты забеспячэння рэгіянальных прыярытэтаў знешнепалітычнай актыўнасці Беларусі [61].

Асноўныя аспекты знешняй палітыкі незалежнай Беларусі даследавалі У. Я. Улахович [62], А. В. Шарапа [66].

У працах прафесара У. Е. Снапкоўскага, прысвечаных навуковаму аналізу зместа знешняй палітыкі незалежнай Беларусі, гэтая палітыка аналізуецца як сфера дзяржаўнай дзейнасці і прадмет навуковага вывучэння, разглядаюцца яе канцэптуальныя асновы, раскрываюцца асаблівасці геапалітычнага становішча Беларусі паміж Усходам і Захадам і пошук беларускім палітычным класам балансу паміж цэнтрамі сілы, апісваецца шматбаковая дыпламатыя Беларусі [48].

З першых год незалежнай гісторыі Беларусі айчынныя вучоныя актыўна даследавалі праблемы супрацоўніцтва з асобнымі замежнымі краінамі. Зразумела, што найбольш даследаванымі былі адносіны Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. У 2009 г. быў апублікаваны зборнік навуковых артыкулаў У. Е. Снапкоўскага, прысвечаны сучасным на той момант праблемам і аспектам беларуска-расійскіх адносін [55]. Праблемы пабудовы саюзнай дзяржавы даследавалі ў навуковых артыкулах М. Э. Часноўскі [63] і А. В. Шарапа [65].

Беларуска-германскае супрацоўніцтва ў постсавецкі перыяд найбольш дэталёва даследавана ў працах А. У. Русаковіча, які абараніў доктарскую дысертацыю па гэтай тэматыцы і апублікаваў некалькі фундаментальных навуковых прац. У іх аўтар паказаў пазіцыі палітычнага кіраўніцтва Беларусі і Германіі ў развіцці міждзяржаўных сувязей, вызначыў месца і ролю двухбаковых дзяржаўна-палітычных адносін у знешнепалітычнай стратэгіі Рэспублікі Беларусь і Федэратыўнай Рэспублікі Германія, раскрыў этапы эвалюцыі супрацоўніцтва Беларусі і Германіі, істотныя праблемы і супярэчнасці гэтага супрацоўніцтва [39; 40].

Месца краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў міжнародных адносінах і іх узаемаадносіны з Рэспублікай Беларусь таксама шырока даследаваліся ў постсавецкі перыяд. Пры гэтым вывучаліся адносіны як з усім рэгіёнам, так і з асобнымі краінамі.

Традыцыйна найбольш даследаванымі двухбаковымі адносінамі з краінамі рэгіёну былі беларуска-польскія. Узаемаадносіны Беларусі і Польшчы вывучаліся на высокім навуковым узроўні (У. Е. Снапкоўскі [54; 58], М. Э. Часноўскі [64]), абмяркоўваліся на міжнародных канферэнцыях [2; 3], даследаваліся на дысертацыйным узроўні [17]. Таксама ў постсавецкі перыяд пачалося вывучэнне двухбаковых адносін з Украінай, Малдовай, Чэхіяй [11; 21; 24; 68].

Вывучэнне адносін Беларусі з ЗША і заходнееўрапейскімі краінамі першапачаткова набыло істотны імпульс. Але пачынаючы з сярэдзіны 2000-х гг. такія даследаванні значна замарудзіліся, што ў першую чаргу было звязана з пераарыентацыяй знешняй палітыкі краіны на іншыя рэгіёны. Тым не менш, у

постсавецкі перыяд апублікавана некалькі манаграфій і навуковых артыкулаў, абаронены дысертацыі [4; 29; 34; 35].

У постсавецкі перыяд айчынныя вучоныя распачалі даследаванне ўсходняга вектара знешняй палітыкі Беларусі. Даследаванне беларуска-кітайскіх адносін ажыццяўляў В. М. Мацэль, які апублікаваў некалькі значных навуковых прац, у тым ліку манаграфій, і абараніў доктарскую дысертацыю, у якой усебакова прааналізаваў фактары, якія вызначылі станаўленне і развіццё палітыкі Рэспублікі Беларусь на ўсходзе і поўдні Азіі, а таксама шляхі ўдасканалення палітыкі краіны ў гэтым рэгіёне [32; 33].

Увогуле даследаванне двухбаковых сувязей з краінамі Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі і шматбаковых сувязей з гэтымі рэгіёнамі ў постсавецкі перыяд набыло іншае гучанне, хаця і з'яўлялася параўнальна новым накірункам навукова-даследчай работы беларускіх вучоных. Вынікамі даследаванняў у 2006—2022 гг. сталі выданне шэрагу навуковых прац, абарона дысертацый, у тым ліку замежнымі дысертантамі [10; 14; 22; 43].

Адносіны незалежнай Беларусі з міжнароднымі міждзяржаўнымі арганізацыямі займаюць важнае месца ў працах айчынных гісторыкаў і палітолагаў. Агульныя пытанні супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі даследавалі А. П. Грос [13], А. Ф. Доўгань, А. А. Разанаў [16], А. У. Селіванаў [46].

Атрыманне Рэспублікай Беларусь незалежнасці паспрыяла значнаму развіццю міжнародна-палітычных даследаванняў у краіне. Шэраг даследчыкаў закранулі пытанні палітычнага рэгулявання знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. У гэтай галіне трэба адзначыць навуковыя даследаванні Р. А. Есіна [19], Д. М. Любкіна [30], Я. В. Матусевіча [31], А. В. Свірыдава [45], В. А. Серабракова [47].

У 2006—2022 гг. працягнулася выданне зборнікаў дакументаў і матэрыялаў па пытаннях знешняй палітыкі Беларусі, у тым ліку шматтомнага зборніка дакументаў і матэрыялаў, публікацыю якіх ажыццяўлялі сумесна Беларускі дзяржаўны універсітэт, Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь і Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы [4; 12; 20].

Такім чынам, аналіз зместу міжнародных даследаванняў у 2006—2022 гг. паказвае, што на другім этапе постсавецкага перыяду тэматыка навуковых інтарэсаў беларускіх даследчыкаў у галіне гісторыі і палітычных праблем знешняй палітыкі краіны, у параўнанні з савецкім перыядам, значна змянілася. Працягваючы вывучэнне сувязей Беларусі з замежнымі краінамі ў перыяд пасля 1944 г., айчынныя вучоныя больш увагі сталі надаваць знешнепалітычнай гісторыі Беларусі ў пасляравалюцыйны і міжваенны перыяды, знешняй палітыкі ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Некаторыя з тэм упершыню з'явіліся ў беларускай гістарыяграфіі, напрыклад гісторыя дыпламатычнай дзейнасці ВКЛ, вектары знешняй палітыкі незалежнай Беларусі і інш.

За 30 год незалежнасці Беларусі (1992—2022 гг.) вывучэнне гісторыі яе знешняй палітыкі стала важным накірункам гістарычных і палітычных даследаванняў у краіне. У гэтай сферы была праведзена вялікая работа па стварэнні ўласнай навуковай канцэпцыі. Айчынныя даследчыкі сутыкнуліся з шэрагам цяжкасцей, але і дасягнулі значных поспехаў. Беларуская навука ў галіне вывучэння гісторыі і актуальных праблем знешняй палітыкі краіны развівалася ад сумбурнасці і выпадковасці даследаванняў у перыяд з 1992 па 2005 гг. да большай упарадкаванасці ў 2006—2022 гг. Пры гэтым павышэнне якасці навуковых прац адбывалася на фоне ўзрастання іх колькасці.

## Спіс выкарастаных крыніц


1. Бароўская, В. М. Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918—1921 гг.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / Бароўская Вольга Мікалаеўна; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. — Мінск, 2015. — 23 с.
2. Беларуска-польскія адносіны: матэрыялы міжнар. «круглых сталоў». — Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2015. — 114 с.
3. Беларусь — Польшча: два дзесяцігоддзі міждзяржаўных зносін: матэрыялы беларуска-польскага «круглага стала». — Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2010. — 151 с.
4. Беларусь — США: на пути к взаимовыгодному сотрудничеству (1991—2015) / А. С. Кошкин, В. С. Кошелев, Н. А. Семилетников. — Минск: РИВШ, 2019. — 138 с.
5. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914—1991 гг.): зб. дак. і матэрыялаў: у 4 т. — Мінск: Юніпак, 2008—2015.
6. Боровская, О. Н. Советско-польские переговоры 1918—1921 гг. и их влияние на решение белорусского вопроса / О. Н. Боровская. — М.: Алгоритм, 2018. — 287 с.
7. Важник, О. Н. БССР и Польская Народная Республика: экономические, научно-технические и культурные связи в 1949—1979 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Важник Ольга Николаевна; БГУ. — Минск, 2005. — 21 с.
8. Внешняя политика Республики Беларусь в 2000-е годы / Ю. И. Малевич [и др.]; под ред. А. В. Шарапо. — Минск: БГУ, 2011. — 84 с.
9. Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 24 верас. 2009 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш]. — Мінск: Беларус. навука, 2010. — 414 с.
10. Ганбаров, Б. А. Республика Беларусь во внешней политике Азербайджанской Республики в 2001—2012 гг. / Б. А. Ганбаров. — Минск: Право и экономика, 2014. — 200 с.
11. Гарбицкий, С. Б. Беларусь и Чехия: экономические, научно-технические и культурные связи (конец 40-х гг. XX — начало XXI в.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Гарбицкий Сергей Борисович; БГПУ имени Максима Танка. — Минск, 2015. — 22 с.
12. Государственные границы Беларуси: сб. док. и материалов: в 2 т. — Минск: БГУ, 2012—2013.
13. Гросс, Е. П. Международное сотрудничество общественных объединений Республики Беларусь (1991—2010 гг.) / Е. П. Гросс. — Минск: Беларус. навука, 2019. — 251 с.

14. Гусман Гомес, Ф. Эквадор — Беларусь: курс на стратегическое партнерство (2007—2016 гг.) / Ф. Гусман Гомес, А. А. Челядинский. — Минск: Право и экономика, 2017. — 288 с.
15. Дземідовіч, А. В. Вялікае Княства Літоўскае ў знешнепалітычных адносінах Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.15 / Дземідовіч Алена Васільеўна; БДУ. — Мінск, 2012. — 22 с.
16. Довгань, Е. Ф. Организация Договора о коллективной безопасности (2002— 2009 гг.) / Е. Ф. Довгань, А. А. Розанов. — Минск: Ковчег, 2010. — 140 с.
17. Дорняк, И. И. Белорусско-польское экономическое и культурное сотрудничество в 1991—2004 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Дорняк Иосиф Иосифович; Ин-т истории НАН Беларуси. — Минск, 2010. — 24 с.
18. Дядичкина, Н. Е. Международное научное сотрудничество Академии наук БССР (вторая половина 1950-х — 1980-е годы): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Дядичкина Наталья Евгеньевна; БГПУ имени Максима Танка. — Минск, 2009. — 20 с.
19. Есин, Р. О. Политика трансграничного сотрудничества Республики Беларусь в европейской перспективе: региональное измерение: автореф. дис. ... д-ра полит. наук: 23.00.04 / Есин Руслан Олегович; БГУ. — Минск, 2012. — 40 с.
20. Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў. В 10 т. Т. 8—10. — Мінск, 2006—2014.
21. Историко-культурные аспекты чешско-белорусских связей / С. С. Александрович, М. А. Лавринович, П. П. Лозовик [и др.]. — Минск: Изд. центр БГУ, 2019. — 327 с.
22. Казахстанско-белорусские отношения, 1991—2007 гг.: док. и материалы / Посольство Республики Казахстан в Республике Беларусь. — Минск: Изд. центр БГУ, 2009. — 305 с.
23. Кананові, У. І. Дыпламатыя Вялікага княства Літоўскага ў 1480 — першай чвэрці XVI ст. (адносіны з Вялікім княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / Кананові Уладзімір Ільіч; Ін-т гісторыі АН Беларусі. — Мінск, 1995. — 16 с.
24. Кошалеў, М. К. Гісторыя беларуска-малдаўскіх узаемаадносін / М. К. Кошалеў, Т. А. Папоўская. — Мінск: Беларус. навука, 2009. — 187 с.
25. Лазоркина, О. И. Дипломатическая служба Великого княжества Литовского во внешнеполитическом механизме Речи Посполитой в 1600—1697 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Лазоркина Ольга Игоревна; БГУ. — Минск, 2009. — 23 с.
26. Лашкевіч, С. А. Асаблівасці знешнепалітычнай актыўнасці Вялікага Княства Літоўскага (1569—1600 гг.) / С. А. Лашкевіч. — Мінск: БДУ, 2010. — 114 с.
27. Лашкевіч, С. А. Вільня і Масква ў канцы XVI ст.: дыпламатыя кампрамісаў / С. А. Лашкевіч. — Мінск: БДУ, 2016. — 127 с.
28. Лашкевіч, С. А. Дыпламатыя Вялікага Княства Літоўскага ва ўзаемаадносінах Рэчы Паспалітай і Расійскай дзяржавы (1586—1598 гг.): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.15 / Лашкевіч Сяргей Анатольевіч; БДУ. — Мінск, 2014. — 24 с.
29. Лашкевич, С. А. Отношения Беларуси и США в XX веке: историческая ретроспектива / С. А. Лашкевич, А. В. Тихомиров. — Минск: Право и экономика, 2011. — 55 с.
30. Любкин, Д. Н. Сотрудничество Республики Беларусь с Европейским союзом по обеспечению пограничной безопасности: автореф. дис. ... канд. полит. наук: 23.00.04 / Любкин Дмитрий Николаевич; Акад. управления при Президенте Респ. Беларусь. — Минск, 2021. — 22 с.
31. Матусевич, Е. В. Национально-государственные интересы Республики Беларусь в контексте процесса глобализации: автореф. дис. ... д-ра полит. наук: 23.00.04 / Матусевич Евгений Вячеславович; БГУ. — Минск, 2005. — 33 с.
32. Мацель, В. М. Беларусь — Китай: 30 лет по пути дружбы и взаимовыгодного сотрудничества / В. М. Мацель. — Минск: Акад. управления при Президенте Респ. Беларусь, 2022. — 260 с.
33. Мацель, В. М. Политика Республики Беларусь на востоке и юге Азии (1991—2002 гг.): автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.15 / Мацель Валерий Михайлович; Дипломат. акад. МИД России. — М., 2005. — 38 с.
34. Мишуровская, О. Е. Белорусско-итальянские отношения в 1990-х гг. / О. Е. Мишуровская // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. — 2002. — № 4. — С. 60—65.
35. Навощик, Е. В. Белорусско-шведские отношения (1991—2017 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.15 / Навощик Елизавета Владимировна; БГУ. — Минск, 2019. — 24 с.
36. Назаўжды разам (да 80-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР): зб. арт. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А. А. Каваленя (старш.) [і інш.]. — Мінск: Беларус. навука, 2021. — 293 с.
37. Польша — Беларусь (1921—1953): сб. док. и материалов. — Мінск: Беларус. навука, 2012. — 423 с.
38. Раманоўскі, Р. Г. Удзел Беларусі ў дзейнасці ЮНЕСКА (1984—2001 гг.): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.15 / Раманоўскі Раман Генадзевіч; БДУ. — Мінск, 2006. — 20 с.
39. Русакович, А. В. Германия во внешней политике Беларуси (1990—2015 гг.): автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.15 / Русакович Андрей Владимирович; БГУ. — Минск, 2016. — 52 с.
40. Русакович, А. В. Интеграционные процессы на постсоветском пространстве: курс лекций / А. В. Русакович. — Минск: РИВШ, 2019. — 212 с.
41. Рыжскі мір 1921 года і Беларусь (да 100-годдзя заключэння): зб. арт. / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. — Мінск: Беларус. навука, 2022. — 303 с.
42. Свилас, С. Ф. Деятельность Белорусской ССР в ЮНЕСКО (1954—1964 гг.) / С. Ф. Свилас. — Минск: БГУ, 2013. — 463 с.
43. Свилас, С. Ф. Отношения Республики Беларусь со странами арабского мира в 1996—2006 годах / С. Ф. Свилас, Т. В. Евсейчик. — Минск: БГУ, 2009. — 198 с.
44. Свилас, С. Ф. ЮНЕСКО в системе внешнеполитической деятельности Белорусской ССР (1954—1964 гг.): автореф. дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.15 / Свилас Светлана Францевна; БГУ. — Минск, 2018. — 47 с.
45. Свиридов, А. В. Геополитическое пространство Республики Беларусь в условиях глобализации: информационное и политическое измерения: автореф. дис. ... канд. полит. наук: 23.00.04 / Свиридов Артем Васильевич; БГУ. — Минск, 2015. — 23 с.
46. Селиванов, А. В. УВКБ ООН и формирование системы защиты беженцев в Республике Беларусь / А. В. Селиванов. — Минск: Тесей, 2006. — 160 с.
47. Серебряков, В. О. Экономическая дипломатия во внешней политике Республики Беларусь (на примере государств Юго-Восточной Азии): автореф. дис. ... канд. полит. наук: 23.00.04 / Серебряков Вадим Олегович; Акад. управления при Президенте Респ. Беларусь. — Минск, 2021. — 24 с.
48. Снапковский, В. Е. Анализ внешней политики Республики Беларусь / В. Е. Снапковский. — Минск: БГУ, 2021. — 243 с.
49. Снапковский, В. Е. О дипломатическом мастерстве и стиле министра иностранных дел БССР К. В. Киселёва / В. Е. Снапковский // Беларусь в современном мире: материалы XX Междунар. науч. конф., посвящ. 100-летию образования БГУ, Минск, 29 окт. 2021 г. — Минск, 2022. — С. 64—73.
50. Снапковский, В. Е. Союзные республики и советская дипломатия: из истории борьбы СССР за первоначальное членство УССР и БССР в ООН (1943—1945 гг.) / В. Е. Снапковский. — Минск: Право и экономика, 2022. — 366 с.

51. Снапкоўскі, У. Е. Аб пагадненні паміж урадам Беларускай ССР і ЮНРРА ад 18 снежня 1945 года / У. Е. Снапкоўскі // Беларус. думка. — 2018. — № 12. — С. 68—76.
52. Снапкоўскі, У. Е. Аб самастойнасці і залежнасці ў знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР: па матэрыялах беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх дыпламатычных архіваў (1944—1991 гг.) / У. Е. Снапкоўскі // Советский этап в истории Беларуси: сб. науч. ст. участников Респ. науч.-теор. конф., Минск, 5 дек. 2019 г. — Минск, 2019. — С. 167—178.
53. Снапкоўскі, У. Е. Ад Думбартон-Окса да Сан-Францыска: этапы ўключэння Беларускай ССР у склад першапачатковых членаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый / У. Е. Снапкоўскі // Беларусь в геополитических процессах XX — начала XXI в.: сб. науч. ст. / Ин-т истории НАН Беларуси. — Минск, 2017. — С. 162—178.
54. Снапкоўскі, У. Е. Беларуска-польскія адносіны (1918—1989 гг.): даследаванні, дакументы, ілюстрацыі і карты / У. Е. Снапкоўскі. — Мінск: Энцыклапедыкс, 2013. — 231 с.
55. Снапкоўскі, У. Е. Беларуска-расійскія адносіны: зб. навук. арт. / У. Е. Снапкоўскі. — Мінск: БДУ, 2009. — 139 с.
56. Снапкоўскі, У. Е. Дыпламатыя старажытнай Беларусі / У. Е. Снапкоўскі // Веснік М-ва замеж. спраў. — 2002. — № 2. — С. 136—139.
57. Снапкоўскі, У. Е. Пра калізіі знешнепалітычных інтарэсаў Польскай кароны і Вялікага княства ў складзе Рэчы Паспалітай / У. Е. Снапкоўскі // Спадчына. — 1995. — № 3. — С. 189—200.
58. Снапкоўскі, У. Е. Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны, 1918—2017 гг. / У. Е. Снапкоўскі. — Мінск: БДУ, 2017. — 285 с.
59. Снапкоўскі, У. Е. Шлях у ААН: Беларуская ССР — заснавальніца Арганізацыі Аб'яднаных Нацый / У. Е. Снапкоўскі // Беларус. думка. — 2015. — № 5. — С. 77—82.
60. Темушев, В. Н. Первая Московско-литовская пограничная война: 1486—1494 / В. Н. Темушев. — 3-е изд., пераб. — М.: Квадрига, 2017. — 309 с.
61. Тихомиров, А. В. Внешняя политика Республики Беларусь (1991—2015 гг.) / А. В. Тихомиров. — Минск: БГУ, 2017. — 208 с.
62. Улахович, В. Е. Формирование основ внешней политики Республики Беларусь (1991—2005 гг.) / В. Е. Улахович. — Минск: Харвест, 2009. — 352 с.
63. Часноўскі, М. Э. Асаблівасці беларуска-расійскай інтэграцыі ў пачатку XXI ст. / М. Э. Часноўскі // Веснік Брэсц. ун-та. Сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. — 2012. — № 2. — С. 5—13.
64. Часноўскі, М. Э. Беларуска-польскія адносіны ў 1996—1999 гг. / М. Э. Часноўскі // Беларус. гіст. часопіс. — 2000. — № 3. — С. 16—21.
65. Шарапо, А. В. Беларусь и Россия в XXI веке / А. В. Шарапо // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. — 2003. — № 3. — С. 43—45.
66. Шарапо, А. В. Республика Беларусь в контексте геополитики XXI века / А. В. Шарапо. — Минск: БГУ, 2012. — 275 с.
67. Шніп, М. А. Унутрыпалітычны канфлікт 1508 года ў Вялікім княстве Літоўскім у кантэксце міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / Шніп Макар Аляксандравіч; БДУ. — Мінск, 2009. — 24 с.
68. Юрчак, Д. В. Государственно-политические и экономические связи Республики Беларусь с Украиной в 1991—2011 годах: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Юрчак Денис Валерьевич; Ин-т истории НАН Беларуси. — Минск, 2014. — 24 с.
69. Янушкевіч, А. М. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558—1570 гг. / А. М. Янушкевіч. — Мінск: Медысонт, 2007. — 353 с.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 13 чэрвеня 2025 г.